НАША ПАМЯЦЬ

# Вялікі подзвіг у гісторыі маёй сям'і

**На ўсіх узроўнях, падчас розных мерапрыемстваў як наказ гучаць словы пра тое, што святы абавязак старэйшага пакалення – перадаць нашчадкам праўду пра Вялікую Айчынную вайну, пра тое, які непамерны кошт дзяржава заплаціла за незалежнасць. І заўсёды прыемна ўсведамляць, што нашы дзеці жадаюць ведаць яе, вывучаюць падзеі гераічнага мінулага, у тым ліку на прыкладзе сваіх родных.**

**На мінулым тыдні мы адзначылі 80-ю гадавіну вызвалення нашай любай краіны і нашага народа ад нямецка-фашысцкага нашэсця. У гэтай даце зліліся ў адзінае пачуццё шчасце і смутак, радасць і пяшчота, боль і гордасць, якое адгукнулася ў сэрцах людзей званамі памяці.**

І хаця тыя сумныя падзеі ад нас усё далей і далей, аднак нас, 15-16-гадовых юнакоў і дзяўчат, раздзяляе з імі толькі час, а не памяць. Бо хіба можна забыць тых, хто глядзіць нам у вочы са старых, пажаўцелых здымкаў!? Гэта зараз сучасныя каляровыя фота ўкладзены ў прыгожыя альбомы, а тыя захоўваюцца на паліцы шафаў або ўстаўлены ў рамкі і вісяць на сцяне. І здаецца, што гэта не карткі, а жывыя людзі, якія знаходзяцца побач. З імі можна паразмаўляць, параіцца ці проста сустрэцца вачыма. У сялянскіх хатах гэтыя фотаздымкі былі ў адной вялікай рамцы. Яна нібы абдымала, аб'ядноўвала ў адзінае цэлае малых і дарослых, жывых і тых, хто ўжо назаўсёды застаўся толькі ў думках і сэрцах.

Такія вось сямейныя партрэты віселі і ў хаце маёй прабабулі Ніны Аксёнчык. А цяпер аб'яднаў дарагія сэрцу вобразы альбом ужо майго дзядулі. Калі ахоплівае пачуццё настальгіі, дастае яго, перагортвае старонкі, углядаецца ў здымкі. Я люблю ў гэтыя хвіліны задумення быць побач з ім, слухаць ужо каторы раз знаёмыя аповеды пра сваіх продкаў.

**Вайна балюча прайшла па лёсе нашай радні, пакінула свой адбітак і глыбокі след. Вось на першай старонцы альбома сціплы чалавек у салдацкай форме, у пілотцы з зорачкай. Гэта мой прадзед Аксёнчык Аляксандр Ціханавіч.**

У майго таты такая ж усмешка і погляд, як у прадзядулі, ды і я сама нечым падобны да іх (так кажуць мае блізкія), і дзядуля вельмі даражыць гэтым падабенствам.

Прадзед нарадзіўся ў 1926 годзе ў Жыткавіцкім раёне Гомельскай вобласці. Калі пачалася вайна, ён, нягледзячы на юны ўзрост, адразу ўключыўся ў падпольную барацьбу. Разам са сваімі сябрамі хадзіў па лясах, адшукваў зброю. Так сваёй юнацкай нянавісцю да бязлітасных акупантаў хлопцы помсцілі ворагу.

А ў 1943 годзе прадзед Аляксандр разам са сваім бацькам Ціханам далучыліся да партызанскага атрада імя Кастуся Каліноўскага, што дзейнічаў на тэрыторыі Любаншчыны. Самыя розныя заданні прыходзілася выконваць маладому актыўнаму лясному воіну. Не раз жыццё было на самым яго «краечку», як апавядае дзядуля. Але жаданне пазбавіцца ад карычневай чумы, адстаяць кожную пядзю роднай зямлі вяло гарачага патрыёта на самаахвярную барацьбу.



**Аляксандр АКСЁНЧЫК быў і партызанам, і франтавіком.**



**Такімі продкамі нельга не ганарыцца.**

**Пасля вызвалення Любаншчыны ў 1944 годзе ваенныя шляхі смелага і мужнага партызана вялі на фронт. З баямі, стратамі сяброў і перамогамі прадзед дайшоў да Усходняй Прусіі. А пасля з асколачнымі раненнямі вярнуўся дамоў, уладкаваўся на працу ў вёсцы Камуна.**

І сёння я з гонарам усведамляю, што ў вызваленні Бацькаўшчыны ёсць і ўклад маіх родных, якія прайшлі і партызанскімі сцежкамі, і франтавымі дарогамі, праявілі бясстрашша і адвагу, не схіліліся перад цяжкасцямі і не скарыліся ворагу...

Вось дзядуля раскрывае памятную, парыжэлую ад часу скрыначку, у якой знаходзіцца шмат медалёў і ордэн Вялікай Айчыннай вайны II ступені. Разглядваючы іх, задаю самому сабе пытанне: якім жа быў мой прадзед? І як бы чую адказ: «Адважны барацьбіт. Ён заўсёды быў наперадзе, удзельнічаў у самых розных рызыкоўных аперацыях. Смелы і бясстрашны франтавік». Аб гэтым як нельга лепш сведчаць і прадзядулевы ўзнагароды. А калі трымаю яго ордэн на далоні, то адчуваю незвычайную цеплыню. Мне здаецца, што гэта цеплыня адважнага сэрца майго продка...



**У сямейным архіве захоўваецца і такое фота, якое нагадвае пра ліхалецце.**

Вось такая сямейная сцяжынка памяці. Яна вядзе туды, дзе 80 гадоў таму, не шкадуючы свайго жыцця, змагаўся за сваю Радзіму і за мой сённяшні светлы дзень родны чалавек. З ім пераплятаюцца тысячы таких сцяжынак-лёсаў беларускіх сямей. І ў кожнай з іх, як найдаражэйшая каштоўнасць, зберагаюцца фотаздымкі. Іх разглядваюць, па некалькі разоў пераказваюць сямейныя гісторыі нашчадкам. Гэта памяць, якая перадаецца з пакалення ў пакаленне. І з гэтай памяццю мы выходзім штогод у Дзень Перамогі і Дзень вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў на вуліцы вёсак і гарадоў, крочым у калонах з фотаздымкамі і кветкамі.

Так сталася, што я не бачыў свайго прадзеда. Але ў гэтыя святыя для ўсіх беларусаў дні я разам са сваёй малодшай сястрычкай нясу чырвоныя гваздзікі да магілы з зорачкай, каб ушанаваць слаўнага героя нашага роду, што змагаўся дзеля нашай светлай будучыні.



ЛИЧНЫЙ ЛИСТОК
ПО УЧЕТУ ПАРТИЗАНСКИХ КАДРОВ



**Пра пройдзены шлях сведчаць і звесткі з асабовага лістка.**

Мы, пакаленне 15-16-гадовых, радуемся светламу і чыстаму небу і нізка схіляем галовы перад тымі, хто прынёс нам Перамогу, хто аддаў сваё жыццё за наш мірны дзень. Мы помнім! Мы ганарымся! Мы вучымся ў іх жыць!

**Станіслаў АКСЁНЧЫК, СШ №3 г. Любані.**